дзе D – памернасць прасторы прыкмет, μ_i – вектар матэматычнага спадзявання, Σ – матрыца каварыяцыі. Часцей за ўсё ў сістэмах, якія рэалізуюць дадзеную мадэль, выкарыстоўваецца дыяганальная матрыца каварыяцыі. Магчыма таксама выкарыстанне адной матрыцы каварыяцыі для ўсіх кампанентаў мадэлі дыктара або адной матрыцы для ўсіх мадэляў. Такім чынам, для пабудовы мадэлі дыктара неабходна вызначыць вектары сярэдніх, матрыцы каварыяцыі і вагі кампанентаў. Дадзеную задачу вырашаюць з дапамогай алгарытму максімізацыі спадзявання (англ. Expectation Maximization) [12] ці, у некаторых выпадках, з дапамогай больш вылічальна эфектыўнага алгарытму Вітэрбі [13].

У адрозненне ад вектарнага квантавання, мадэль гаусавых сумесяў выкарыстоўвае вобласці ў прасторы прыкмет, якія перакрываюцца паміж сабой:



Малюнак 2.9 – Апраксімацыя размеркавання сумессю нармальных размеркаванняў

Мадэлі гаусавых сумесяў можна будаваць на розных узроўнях. На самым нізкім мадэль будуецца па ўсіх фрэймах усіх запісаў дыктара, прадстаўляючы сабой нейкі ўсярэднены варыянт вымаўлення ім любога гуку – набліжэнне даволі грубае. На больш высокіх маўленне дыктара разбіваецца на класы (гэта могуць быць, напрыклад, гукі) і для кожнага з гэтых класаў будуецца свая мадэль. На самым высокім будуюцца мадэлі мадэляў: характарыстыкі маўлення дыктара, для якога будуецца мадэль, прадстаўляюцца як сумесь характарыстык маўлення дыктараў складзенай загадзя рэферэнтнай базы. Каэфіцыенты атрыманай сумесі з'яўляюцца ўнікальнымі для кожнага дыктара і выкарыстоўваюцца ў якасці яго мадэлі.

У [14] GMM паказалі найлепшыя вынікі пры вырашэнні задачы ідэнтыфікацыі дыктара ў параўнанні з метадам апорных вектараў і алгарытмам дынамічнай трансфармацыі часовай шкалы. У прыватнасці, таму яны выкарыстаны пры пабудове мадэляў у распрацаванай сістэме ідэнтыфікацыі.

2.5.3. Метад апорных вектараў

Метад апорных вектараў (англ. SVM, Support Vector Machines) дазваляе пабудаваць гіперплоскасць у шматмернай прасторы, якая падзяляе два класы, напрыклад, параметраў мэтавага дыктара і параметраў дыктараў з рэферэнтнай базы. Поспех яго прымянення залежыць ад таго, наколькі ўдала падабрана нелінейнае пераўтварэнне прасторы вымераных параметраў у кожным канкрэтным выпадку пры распазнанні дыктараў.

Метад апорных вектараў можа прымяняцца ў камбінацыі з метадам GMM або метадам схаваных маркаўскіх мадэляў (англ. HMM, Hidden Markov Models) [15], зарэкамендаваў сябе ў задачах аўтаматычнага распазнавання маўлення.

2.5.4. Нейронавыя сеткі

Канкрэтная мадэль у гэтым выпадку будуецца асобна для кожнай задачы на аснове існуючых мадэляў (такіх, як шматслойныя персептроны, рэкурэнтныя сеткі, сеткі на аснове радыяльна-базісных функцый, сеткі прамога распаўсюджвання, свёртачныя сеткі і іншыя). Недахопам гэтага падыходу з'яўляецца тое, што поўны працэс навучання можа патрабаваць вялікіх часавых і вылічальных выдаткаў. Патрабуецца падбіраць шмат характарыстык сеткі і параметраў навучання, і гэты выбар невідавочны. Тым не менш нейронавыя сеткі выкарыстаны ў многіх работах, яны гнуткія і могуць быць арыентаваны на рашэнне канкрэтнай праблемы распазнавання, напрыклад, праблемы наяўнасці значных акустычных шумоў. Перспектыўным напрамкам сёння з'яўляецца выкарыстанне глыбокіх нейронавых сетак (англ. Deep Neural Networks) у сферы распазнання маўлення [16], як і пры вырашэнні задач распазнавання вобразаў у цэлым.

2.5.5. I-vectors

У нядаўніх даследаваннях і публікацыях [25], [26] папулярнасць набірае мадэляванне характарыстык дыктара з дапамогай так званых i-vectors. Іх знаходжанне ўяўляе сабой працэс імавернаснага сціску, які паменшвае памернасць супервектараў у адпаведнасці з лінейнай гаусавай мадэллю. Супервектар s медыян мадэляў гаусавых сумесяў зыходнага запісу праецыруецца на прастору нізкай памернасці, названую Total Variability Space:

$$s = m + Tw \tag{2.8}$$

дзе T – матрыца Total Variability (англ. Total Variability matrix), m – незалежны ад дыктара супервектар медыян універсальнай фонавай мадэлі (англ. UBM, Universal Background Model), w – залежны ад канала і дыктара i-vector.

Іх з'яўленне стала развіццём сумеснага фактарнага аналізу (англ. JFA, Joint Factor Analysis) GMM-мадэляў, у якіх аналізуемы вектар запісу раскладваюць на кампаненты, залежныя ад дыктара, незалежныя ад дыктара, залежныя ад канала і рэшткавыя, пасля таго, як было заўважана, што залежныя ад канала кампаненты таксама нясуць інфармацыю пра дыктара. У JFA выкарыстоўваецца, магчыма, занадта моцная здагадка пра фактарызацыю і незалежнасць гэтых кампанент. Пры ідэнтыфікацыі дыктара з дапамогай i-vectors інфармацыю пра канал кампенсуюць часцей за ўсё з дапамогай PLDA (англ. Probability Linear Discriminant Analysis), якая дазваляе карэляцыю паміж кампанентамі.

Адным з недахопаў i-vectors лічыцца іх нестабільнасьць у розных умовах запісу, адчувальнасць да змены канала.

2.6. Аналіз рынку сістэм ідэнтыфікацыі дыктара

У апошнія гады назіраецца павелічэнне попыту на паслугі галасавой біяметрыі ў такіх сферах, як мабільны банкінг, судова-медыцынская экспертыза, ахова здароўя, сістэмы дзяржаўнай бяспекі.

Лідэрам на сусветным рынку ў сферы распазнання маўлення, якая займае больш за палову яго долі, з'яўляецца транснацыянальная карпарацыя Nuance Communications (распрацоўшчык інтэрактыўнага сэрвісу Siri кампаніі Apple). Яна распрацоўвае праграмы ў многіх сумежных галінах: для мабільнай верыфікацыі, праваахоўных органаў, экспертнага аналізу галасавых запісаў, ідэнтыфікацыі банкаўскіх кліентаў (Nuance Forensics, Nuance Identifier, Nuance Mobile Identifier і інш.). На расійскім рынку лідэрам можна лічыць кампанію Маўленчыя тэхналогіі, якая зрабіла платформу галасавой ідэнтыфікацыі і верыфікацыі VoiceKey, укаранёную, напрыклад, у ААТ «Прыорбанк», і сістэму крыміналістычнага ўліку і біяметрычнага пошуку па голасе і твары VoiceGrid. Сярод іншых рашэнняў можна згадаць сістэму KIVOX Passive Detection і Voice ID амерыканскай кампаніі Agnitio, а таксама Voiceprint Recognition Engine кітайскай кампаніі IFLYTEK. Але прадукты гэтых кампаній пакуль досыць дарагія, і не ўсе прадпрыемствы і ўстановы дазваляюць сабе іх выкарыстоўваць.

Менш вядомыя прадукты часта апісаны павярхоўна, што не дазваляе быць упэўненымі ў іх якасці (3I SpeakerID кампаніі 3I Technologies, сістэма мульцібіяметрычнай ідэнтыфікацыі BioLink AMIS кампаніі BioLink), альбо маюць шэраг недахопаў. Тэхналогія GritTec's Speaker-ID расійскай кампаніі GritTec забяспечвае дакладнасць ідэнтыфікацыі толькі 85% пры розных каналах пры навучанні і распазнанні і 90% пры аднолькавых. Да таго ж падтрымлівае мала фарматаў запісаў (з папулярных толькі wav з частатой 8 кГц) і мае графічны

інтэрфейс толькі для Windows. Сістэма VoiceCompare расейскай кампаніі «ПронтоТелеком», калі верыць апісанню на сайце [17], гарантуе дакладнасць ужо 93-95%, пры гэтым прызначана толькі для Windows і працуе толькі з тым жа васьмікілагерцовым wav.

На беларускім рынку сістэмы галасавой ідэнтыфікацыі пакуль не распаўсюджаны, таму беларускія прадпрыемствы або карыстаюцца дарагімі расійскімі і яшчэ больш дарагімі амерыканскімі камерцыйнымі прадуктамі, або – часцей за ўсё – увогуле не вырашаюцца ўкараняць такія сістэмы, хоць і маюць у гэтым патрэбу. Таму распрацоўка надзейнай сістэмы ідэнтыфікацыі дыктараў для нашага рынка з'яўляецца задачай актуальнай, хоць і патрабуе добрых алгарытмічных распрацовак, сумесных намаганняў спецыялістаў па апрацоўцы гуку, праграмістаў і добрых маркетолагаў.

2.7. Аналіз існуючых сэрвісаў апрацоўкі маўлення

Большасць існуючых сэрвісаў, якія працуюць з прамовай, такіх, як Google Cloud Speech API, Bing Speech API, API.AI, SpeechKit Cloud API, арыентаваны ў першую чаргу на распазнанне маўлення, у другую чаргу – на сінтэз маўлення, і толькі некаторыя прапануюць дадатковыя функцыі (аналіз намераў у API.AI або сэнсавы разбор у SpeechKit Cloud API). Сервіс 3і Speech Recognition API, які знаходзіцца на момант напісання гэтай працы ў тэставай версіі, прапануе таксама падзел дыялогаў па дыктарам (дыярызацыю), вызначэнне полу, шумоў і паўз. Але бясплатнае карыстанне ім абмежавана тэставым перыядам (як і карыстанне SpeechKit Cloud, і шматлікімі іншымі).

Беларуская анлайн-платформа апрацоўкі прамовы corpus.by [18] вылучаецца вялікай разнастайнасцю функцыяналу: каля пяцідзесяці сэрвісаў, кожны з якіх вырашае асобную задачу накшталт генерацыі транскрыпцыі, падзелу слоў на склады, падліку частотнасці слоў і таму падобнага. Унікальная яна і тым, што акрамя рускай і ангельскай мовы падтрымлівае яшчэ і беларускую – прычым як асноўную мову; і тым, што знаходзіцца ў бясплатным адкрытым доступе. Прадстаўленыя сервісы можна выкарыстоўваць для аўтаматычнай апрацоўкі дадзеных пры стварэнні ўласных лінгвістычных мадэляў. Да таго ж па той прычыне, што сэрвіс распазнання дыктараў там не прапаноўваецца, можна паспрабаваць у якасці такога сэрвісу укараніць распрацаваную сістэму галасавой ідэнтыфікацыі.

2.8. Аналіз залежнасці існуючых сістэм ідэнтыфікацыі дыктара ад мовы

Большасць існуючых сістэм ідэнтыфікацыі дыктара не выкарыстоўваюць асаблівасці мовы, на якой гавораць дыктары. Гэта тычыцца нават сістэм ідэнтыфікацыі дыктараў, якія размаўляюць на некалькіх мовах, такіх, як [21], [22], [23], [24]. Замест гэтага сістэмы распазнання шматмоўных дыктараў

імкнуцца падабраць такую камбінацыю прыкмет, якая менш залежыць ад асаблівасцяў мовы, ахвяруючы пры гэтым якасцю распазнавання для любой асобна ўзятай мовы. Напрыклад, у [23] для гэтага выкарыстоўваюцца прасадычныя прыкметы (інтанацыя і энергія).

Разам з тым сістэмы, дзе распазнаванне заснавана на разбіцці на фанемы, ускосна залежаць ад мовы ўжо таму, што ад яе залежыць набор фанем. Так, у [24] для кожнай мовы выкарыстоўваецца свой «распазнавальнік фанем» (англ. Phone recognizer), і пры распазнаванні маўленне аналізуецца кожным з гэтых «распазнавальнікаў».

Магчымасць выкарыстоўваць асаблівасці мовы існуе як для аднамоўных сістэм, так і для шматмоўных, якія выкарыстоўваюць асобныя аналізатары для кожнай мовы. Звычайна адрозненне такіх аналізатараў не ў выкарыстаных алгарытмах, а ў дадзеных, на якіх адбываецца іх навучанне. Калі мадыфікаваць і самі алгарытмы, можна дамагчыся больш высокай якасці, але вызначыць напрамкі такіх мадыфікацый уяўляецца досыць складанай задачай.

3. Мадэль распрацаванай сістэмы ідэнтыфікацыі дыктара

3.1. Выбар прыкмет для аналізу пры апрацоўцы сігналаў

Пры вырашэнні задачы 3.а фізіялагічныя характарыстыкі прамовы былі выкарыстаны як асноўныя, але пры гэтым было даследавана і ўключэнне ў сістэму дадатковых часавых, статыстычных, некаторых прасадычных прыкмет.

У якасці нізкаўзроўневых спектральных каэфіцыентаў пры навучанні распрацаванай сістэмы можна выкарыстоўваць як MFCC, так і PLP каэфіцыенты (і іх вытворныя). Але эксперыменты паказалі, што PLP каэфіцыенты не далі пераваг у дакладнасці ідэнтыфікацыі ў параўнанні з MFCC, таму было вырашана па змаўчанні выкарыстоўваць мел-частотныя кепстральныя каэфіцыенты як пры навучанні, так і пры распазнаванні дыктараў. Рэалізацыя алгарытму іх вылічэння прадстаўлена ў лістынгу А.4 прыкладання А. Для даследавання магчымасці павелічэння дакладнасці распазнання, звязанай з наяўнасцю ўнікальных характарыстык маўлення чалавека ў галіне высокіх частот, была дададзена опцыя дапаўнення вектара мел-частотных каэфіцыентаў значэннямі каэфіцыентаў IMFCC.

Пры здабыванні прыкмет для кожнага акна сігналу магчыма вылічэнне адвольнай колькасці кароткачасовых прыкмет, якія аб'ядноўваюцца ў адзіны супервектар. Гэта робіцца для кожнай фанемы дыктара наступным чынам:

1) задаюцца вектар сэмплаў сігналу data, аконная функцыя, памер акна ў секундах (windowSize), памер кроку ўзяцця акна (hop), пачатак start і канец end фанемы ў секундах;
2) у залежнасці ад частаты дыскрэтызацыі запісу samplingRate вылічваецца колькасць сэмплаў у акне як windowSize * samplingRate, колькасць сэмплаў у кроку ўзяцця акна як hop * samplingRate і велічыня offset водступаў ад пачатку і канца фанемы;
3) вылічваюцца індэксы пачатку сэмплаў фанемы як max(start * samplingRate – offset, 0) і канца сэмплаў фанемы як min(end * samplingRate + offset, |data|);
4) кожны вектар сэмплаў фанемы (акно) з вылічанным памерам бярэцца з вылічанным крокам і дамнажаецца на вектар аконнай функцыі;
5) для атрыманнага вектару будуецца вектар кароткачасовых прыкмет;
6) вектар дадаецца да супервектару дадзенай фанемы дадзенага дыктара.

Рэалізацыя гэтага алгарытму прадстаўлена ў лістынгу А.2 дадатку А.

Для падаўлення шумоў у якасці перадапрацоўкі сігналу пры навучанні лінгвістычнай мадэлі выкарыстоўвалася выдаленне пастаяннага амплітуднага зрушэння, дызерынг і павелічэнне амплітуды высокачастотных кампанент

сігналу. Таксама выдаляліся доўгія фрагменты з «цішынёй». Пасля вылічэння кепстральных каэфіцыентаў для кожнага дыктара выконваецца нармалізацыя іх матэматычнага спадзявання і дысперсіі для памяншэння ўплыву фонавых шумоў.

Было вырашана не ўключаць у сістэму такія прасадычных характарыстыкі, як тэмп гаворкі ці інтанацыю, бо яны занадта моцна залежаць ад кантэксту паведамлення і да таго ж лёгка паддаюцца наўмыснаму скажэнню. Быў таксама даследаваны ўплыў уключэння эфектыўнай працягласці гучання (якая гаворыць пра сумарную працягласць паўз у маўленні) на якасць распазнавання і ўстаноўлена, што яно не вядзе да істотнага яго паляпшэння. Тым не менш, распрацаваны алгарытм дазваляе ўключаць у сістэму такія характарыстыкі, і, калі будуць знойдзены тыя з іх, што прывядуць да стабільнага паляпшэння якасці, яны будуць выкарыстоўвацца як дадатковыя прыкметы пры фарміраванні мадэлі дыктара.

3.2. Алгарытмы фарміравання мадэляў, іх параўнання і прыняцця рашэнняў

Па той прычыне, што, з аднаго боку, распрацаваная сістэма ідэнтыфікацыі дыктара павінна быць тэкстанезалежнай, а з другога – выкарыстанне выключна нізкаўзроўневай інфармацыі не забяспечвае належнай якасці распазнавання, пры рашэнні задачы 3.b быў зроблены выбар будаваць высокаўзроўневую тэкстазалежную лінгвістычную мадэль толькі пры першапачатковым навучанні і карыстацца ёй пры даданні ў сістэму новых дыктараў. Лінгвістычная мадэль дазваляе выконваць пофанемнае разбіццё навучальных запісаў дыктара, якое выкарыстоўваецца пры фарміраванні яго індывідуальнай мадэлі вымаўлення розных фанем. Пры распазнанні жа лінгвістычная інфармацыя не ўлічваецца і не выконваецца разбіццё тэставага запісу на фанемы, што дазваляе значна паскорыць гэты працэс.

Такім чынам, распрацаваная сістэма выкарыстоўвае наступныя мадэлі:

- адну лінгвістычную мадэль для ўсіх дыктараў;
- індывідуальныя мадэлі вымаўлення фанем для кожнага дыктара.

3.2.1 Пабудова лінгвістычнай мадэлі

Лінгвістычная мадэль фарміруецца паэтапна: на кожным кроку будуецца больш дасканалая мадэль на аснове папярэдняй.

1) Спачатку вылічваюцца нізкаўзроўневыя прыкметы і выконваецца нармалізацыя іх матэматычнага спадзявання і дысперсіі;

2) На аснове знойдзеных нізкаўзроўневых прыкмет і іх вытворных на аснове алгарытмаў мадэлявання гаусавых сумесяў і схаваных маркаўскіх мадэляў

будуюцца мадэлі фанем без выкарыстання інфармацыі аб іх узаемным размяшчэнні і ўплыву яго на гучанне фанем.

3) На аснове мадэляў манафонаў фармуюцца мадэлі трыфонаў, пры гэтым выкарыстоўваюцца не ўсе магчымыя спалучэнні фанем, бо іх колькасць была б роўная колькасці фанем у кубе, а толькі іх найбольш распаўсюджаная частка, якая фарміруецца з дапамогай фанетычнага дрэва рашэнняў.

4) Далей з дапамогай лінейнага дыскрымінантнага аналізу памяншаецца памернасць прасторы ўваходных дадзеных шляхам пабудовы станаў маркаўскіх мадэляў для зыходных вектараў прыкмет.

5) Потым з дапамогай лінейных пераўтварэнняў прыкмет, якія максімізуюць сярэдняе праўдападабенства, у новай рэдуцыраванай прасторы фармуюцца матрыцы трансфармацый для кожнага дыктара. У некаторых сістэмах [19] гэтыя матрыцы выкарыстоўваюцца як прыкметы для ідэнтыфікацыі дыктара, але ў гэтым выпадку памернасць прасторы прыкмет дыктара атрымліваецца вялікай, а алгарытм ідэнтыфікацыі – працаёмкім.

6) На апошнім этапе (англ. SAT, Speaker Adaptive Training) атрыманыя матрыцы трансфармацый выкарыстоўваюцца для нармалізацыі інфармацыі аб дыктарах у мадэлях трыфонаў, дзякуючы чаму разбіццё на фанемы адбываецца ўжо ў прасторы дыктаранезалежных прыкмет. Для выдалення з прыкмет інфармацыі пра дыктара выкарыстоўваецца алгарытм лінейнай рэгрэсіі максімальнага праўдападабенства (англ. FMLLR, Feature Space Maximum Likelihood Linear Regression) [19]: вектары прыкмет запісаў дамнажаюцца на матрыцы, зваротныя матрыцам трансфармацыі іх аўтараў.

7) Для ўдакладнення параметраў пасля навучання кожнай новай мадэлі зноўку выконваецца пафанемное выраўноўванне навучальных запісаў згодна алгарытму навучання Вітэрбі.

Гэтыя крокі апісаны ў скрыпце train_ali.sh (гл. лістынг А.6 прыкладання А).

3.2.2. Пабудова мадэлі дыктара

Пры пабудове мадэлі дыктара вылічаюцца вектары прыкмет для кароткачасовых сумежных адрэзкаў прамовы, што перакрываюцца паміж сабой. Затым яны групуюцца па фанемах, якім належаць, і аб'ядноўваюцца ў супервектары, як паказана на малюнку 3.1. Інфармацыя пра прыналежнасць кожнага адрэзка пэўнай мадэлі дыктара атрымліваецца з дапамогай найбольш дасканалай з лінгвістычных мадэляў, а канкрэтна – SAT-мадэлі.



Малюнак 3.1 – Схема групоўкі адрэзкаў запісу для фанемы

Такім чынам, збіраецца інфармацыя пра вымаўленне дыктарам розных фанем. Для кожнай фанемы будуецца і захоўваецца мадэль гаусіан (гл. лістынг А.1 прыкладання А). Асераднёныя па адрэзках статыстычныя прыкметы, адрозныя ад спектральных каэфіцыентаў і іх вытворных, не ўдзельнічаюць у фарміраванні GMM, а захоўваюцца асобна для забеспячэння аднастайнасці мадэляў гауссовых сумесяў. Дзякуючы таму, што кожная з гэтых прыкмет ўяўляе сабой адзін лік (напрыклад, спектральны цэнтроід або пікавае значэнне сігналу), пры наступным вызначэнні ступені прыналежнасці адрэзка прамовы той ці іншай фанеме можна вылічваць модулі іх рознасці з тымі ці іншымі вагавымі каэфіцыентамі.

Было вырашана не будаваць мадэль дыктара на самым высокім узроўні, прадстаўляючы яго вымаўленне як сумесь вымаўленняў дыктараў рэферэнтнай базы, бо, па-першае, фарміраванне такой базы можа апынуцца вельмі працаёмкім, а па-другое, для яе рэалізацыі пры распазнаванні трэба будаваць паўнавартасную мадэль меркаванага дыктара, каб мець магчымасць пабудаваць яе раскладанне па ўзорных мадэлях. Гэта вядзе да павелічэння патрабаванняў да колькасці і якасці запісаў для распазнавання і павелічэнню вылічальных выдаткаў, у нашым выпадку звязаных з разбіццём запісу на фанемы.

3.2.3. Параўнанне мадэляў і прыняцце рашэнняў

Пры вызначэнні аўтара запісу гэты запіс разбіваецца на адрэзкі аднолькавай даўжыні і для кожнага адрэзка прамовы вылічаецца яго падобнасць на фанемы кожнага дыктара.

Мерай блізкасці вектара прыкмет адрэзка прамовы і фанемы з'яўляецца сярэдняя лагарыфмічная верагоднасць мадэлі гаусіан фанемы, якая вылічана для гэтага вэктару. Калі апроч гаусавых мадэляў для фанемы вылічаны якія-небудзь статыстыкі, яны вылічаюцца і для разгляданага ўчастка сігналу, і да выніку

дадаюцца модулі рознасці адпаведных статыстык, памножаныя на вагавыя каэфіцыенты.

Рашэнне прымаецца метадам k бліжэйшых суседзяў: для адрэзка шукаецца k фанем з мінімальнай адлегласцю і выбіраецца дыктар, якому належыць найбольшая колькасць гэтых фанем. Магчымы і ўзважаны варыянт, калі выбіраецца дыктар сярод аўтараў k бліжэйшых фанем, фанемы якога ў сярэднім найбольш блізкія да разглядаемага адрэзку прамовы.

Алгарытм вызначэння дыктару па кароткачасовых прыкметах пры k=1 выглядае наступным чынам:

1) задаюцца вектар сэмплаў сігналу data, аконная функцыя, памер акна ў секундах (windowSize), памер кроку ўзяцця акна (hop);
2) у залежнасці ад частаты дыскрэтызацыі запісу samplingRate вылічваецца колькасць сэмплаў у акне як windowSize * samplingRate і колькасць сэмплаў у кроку ўзяцця акна як hop * samplingRate;
3) кожны вектар сэмплаў запісу (акно) з вылічанным памерам бярэцца з вылічанным крокам, далей кожнае такое акно:
   a) дамнажаецца на вектар аконнай функцыі;
   b) для атрыманнага вектару будуецца вектар кароткачасовых прыкмет;
   c) для кожнай фанемы кожнага дыктара вылічваецца верагоднасць яе падабенства вектару прыкмет;
   d) для дыктара, якому належыць фанема з самай вялікай верагоднасцю, павялічваецца лічыльнік;
4) дыктар з найбольшым значэннем лічыльніка выбіраецца як самы верагодны аўтар запісу.

Рэалізаваны алгарытм прыняцця рашэння прадстаўлены ў лістынгу А.3 прыкладання А.

Пры прыняцці рашэння на адкрытым мноcтве дыктараў улічваецца верагоднасць аўтарства ў параўнанні з астатнімі дыктарамі. Калі яна нізкая, дыктар разглядаецца як невядомы.

3.3. Архітэктура сістэмы

Распрацаваная праграма ўключае ў сябе пяць падсістэм:

- падсістэма здабывання прыкмет;
- падсістэма фарміравання лінгвістычнай мадэлі;
- падсістэма фарміравання мадэляў дыктараў;
- падсістэма распазнавання дыктараў;
- падсістэма карыстальніцкага інтэрфейсу.

Кампаненты гэтых падсістэм прадстаўлены ў табліцы 3.1; там жа апісаны задачы, якія выконваюцца кожным модулем.

Табліца 3.1 – Апісанне модуляў распрацаванай сістэмы ідэнтыфікацыі дыктара

Падсістэма	**Модуль падсістэмы**	**Задача модуля**
Знаходжанне прыкмет	Чытанне запісаў	Счытванне гукавых файлаў і прывядзенне іх да адзінага фармату
	Папярэдняя апрацоўка сігналаў	Апрацоўка дадзеных з мэтай падаўлення шумоў
	Разбіццё на вокны	Разбіццё запісаў на кароткачасовыя адрэзкі і прымяненне да іх аконнай функцыі
	Вылічэнне прыкмет	Вылучэнне прыкмет ў гукавым сігнале
Пабудова лінгвістычнай мадэлі	Мадэляванне манафонаў	Фарміраванне акустычных мадэляў дадзеных пры навучанні, незалежных ад узаемнага размяшчэння элементаў (фанем)
	Мадэляванне LDA-MLLT трыфонаў	Фарміраванне кантэкстна-залежных акустычных мадэляў дадзеных пры навучанні на аснове алгарытмаў лінейнага дыскрымінантнага аналізу і лінейных пераўтварэнняў прыкмет, якія максімізуюць сярэдняе праўдападабенства (англ. Linear Discriminant Analysis – Maximum Likelihood Linear Transform)
	Мадэляванне SAT трыфонаў	Фарміраванне кантэкстна-залежных акустычных мадэляў дадзеных пры навучанні з выкарыстаннем нармалізацыі дыктараў (англ. Speaker Adaptive Training)
Пабудова мадэляў дыктараў	Выраўноўванне межаў фанем	Пафанемнае выраўноўванне запісаў пры навучанні
	Пабудова мадэляў фанем	Пабудова GMM-мадэляў фанем пры навучанні
Распазнаванне дыктараў	Параўнанне з мадэлямі фанем	Вылічэнне ступені падабенства кароткіх неўпарадкаваных адрэзкаў запісу мадэлям фанем
	Вылічэнне дадатковых прыкмет	Вылічэнне неспектральных (напрыклад, статыстычных) прыкмет для кароткіх неўпарадкаваных адрэзкаў запісу

Працяг табліцы 3.1

Падсістэма	**Модуль падсістэмы**	**Задача модуля**
Распазнаванне дыктараў	Вызначэнне дыктара	Прыняцце рашэння наконт прыналежнасці запісу таму ці іншаму дыктару
Карыстальніцкі інтэрфейс	Вэб-сервіс (узаемадзеянне з карыстальнікамі)	Даванне карыстальнікам інтэрфейсу да падсістэм фарміравання мадэляў дыктараў і распазнавання запісаў
	Скрыпты (узаемадзеянне з ўнутранымі карыстальнікамі)	Даванне карыстальнікам-лінгвістам інтэрфейсу для паляпшэння лінгвістычнай мадэлі шляхам дабаўлення запісаў для навучання і папаўнення лексікона

Сістэма прадстаўлена вэб-серверам, серверам для фарміравання мадэляў дыктараў, серверам для распазнання дыктараў па запісах іх прамовы, модулем здабывання прыкмет і модулем для фарміравання лінгвістычнай мадэлі, як паказана на малюнку 3.2.



Малюнак 3.2 – Архітэктура сістэмы ідэнтыфікацыі дыктара

Вэб-сервіс дае інтэрфейс да падсістэм фарміравання мадэляў дыктараў і распазнавання гэтых дыктараў па іх запісах, а доступ да падсістэмы фарміравання лінгвістычнай мадэлі прадастаўляецца толькі унутраным карыстальнікам сістэмы (лінгвістам) праз камандны радок.

Першапачаткова лінгвістамі фармуюцца базы запісаў маўлення для выбраных моў (беларускай і ангельскай), якія выкарыстоўваюцца пры фарміраванні лінгвістычных мадэляў для гэтых моў. Далей гэтыя мадэлі выкарыстоўваюцца серверам, які стварае мадэлі дыктараў на аснове іх запісаў, атрыманых з вэб-сервера (таксама гэта могуць быць загадзя нарыхтаваныя запісы, якія паказваюцца карыстальнікам у якасці прыкладу пры дэманстрацыі працы сістэмы). Мадэлі дыктараў выкарыстоўваюцца падсістэмай, якая адказвае за іх распазнаванне.

Запісы, атрыманыя ад карыстальнікаў пры распазнаванні, захоўваюцца на серверы толькі ў межах запыту. Запісы, атрыманыя ад карыстальнікаў пры даданні імі дыктараў у сістэму, назапашваюцца на вэб-серверы і перыядычна выкарыстоўваюцца для паляпшэння лінгвістычнай мадэлі шляхам яе паўторнай пабудовы. Пры гэтым ёсць некалькі варыянтаў фарміравання лексікону:

1) выкарыстоўваць першапачаткова створаны для дадзенай мовы лексікон;
2) даць карыстальнікам магчымасць папаўняць лексікон;
3) даць унутраным карыстальнікам-лінгвістам магчымасць папаўняць лексікон.

У выпадку давання карыстальнікам магчымасці дадаваць словы ў лексікон неабходны ўдзел лінгвіста для ацэнкі таго, ці сапраўды прапанаваныя словы існуюць ці пачынаюць існаваць у мове.

3.4. Асноўныя сцэнары выкарыстання

Праца сістэмы ідэнтыфікацыі дыктара працякае па адным з трох асноўных сцэнарыяў:

- спецыяліст фармуе лінгвістычную мадэль для абранай мовы;
- карыстальнік дадае новага дыктара ў сістэму для абранага датасэта;
- карыстальнік распазнае аўтара запісу сярод дыктараў абранага датасэта.



Малюнак 3.3 – Схема фарміравання лінгвістычнай мадэлі

Схема фарміравання лінгвістычнай мадэлі мовы, якая дае магчымасць выконваць разбіццё маўлення на фанемы, прадстаўлена на малюнку 3.3. Ад якасці гэтай мадэлі будзе моцна залежаць дакладнасць распазнавання, таму пажадана, каб сумарная працягласць ўваходных запісаў была вялікая і каб іх змест быў максімальна разнастайны лексічна і фанетычна.



Малюнак 3.4 – Схема дадання новага дыктара ў сістэму ідэнтыфікацыі

Схема дадання новага дыктара ў сістэму прадстаўлена на малюнку 3.4. Запісы апрацоўваюцца незалежна ад запісаў астатніх дыктараў, апрацоўка ўключае вылічэнне нізкаўзроўневых характарыстык маўлення і фарміраванне

гаусавых мадэляў вымаўлення ім фанем на аснове гэтых характарыстык. Каб пазбавіць карыстальніка ад неабходнасці суправаджаць свае запісы граматна напісаным тэкстам і забяспечыць паўнату сфармаваных мадэляў, можна прапаноўваць яму чытаць нарыхтаваныя абзацы, што складаюцца так, каб ўключаць у сябе максімальную колькасць фанем мовы.



Малюнак 3.5 – Схема распазнання дыктара па запісе яго маўлення

Схема распазнання аўтара запісу маўлення (рашэння задачы 3.с) прадстаўлена на малюнку 3.5. Магчымы як непасрэдны запіс з мікрафона, так і загрузка існуючага аўдыёфайла аднаго з фарматаў, якія падтрымліваюцца сістэмай. Патрабуецца толькі каб гаворка была на мове абранага датасэта.

4. Рэалізацыя сістэмы ідэнтыфікацыі дыктара

4.1. Стварэнне акустычнай базы дадзеных для беларускай мовы

Калі для ангельскай мовы існуюць гатовыя акустычныя базы, то для беларускай мовы стварэнне такой базы – асобная і досыць працаёмкая задача. У АІПІ НАН Беларусі за гэтую задачу ўзяліся, было вырашана ствараць акустычную базу на аснове чытання дыктарамі нарыхтаванага тэксту. На момант, калі аўтар далучыўся да каманды, да начыткі тэкстаў было прыцягнута каля шасцідзесяці носьбітаў мовы, а таксама быў складзены слоўнік праграмна згенераваных і праверaных лінгвістамі фанетычных транскрыпцыі. Стварэнне акустычнай базы выбраным спосабам патрабуе вырашэння наступных задач:

1) падрыхтоўка тэкставага корпуса;
2) падрыхтоўка запісаў маўленчага сігналу, адпаведнага тэкставаму корпусу;
3) структурызацыя атрыманых дадзеных і суправаджэнне іх метададзенымі.

Перад начыткай прыгатаваны загадзя тэкставы корпус на беларускай мове разбіваецца на пранумераваныя невялікія абзацы па некалькі сказаў. Запісы захоўваюцца ў фармаце wav, называюцца па правілу «нумар дыктара» + «-» + «нумар тэксту» + «-» + «нумар абзаца» + «.wav» і згрупаваны па папках з імёнамі ў фармаце «нумар дыктара» + «-» + «нумар тэксту». Для стварэння акустычнай базы на аснове наяўных запісаў прамовы і тэксту адпаведных абзацаў, гэта значыць для вырашэння апошняй задачы, выкарыстоўваецца наступны алгарытм:

1) стварыць «вычышчаны» тэкст на аснове наяўнага, для чаго
    a. выдаліць знакі прыпынку;
    b. замяніць абрэвіятуры, скарачэння, колькасці, сімвалы, што чытаюцца ўслых, і т.п. словамі ў той форме, у якой яны чытаюцца дыктарам (але пры магчымасці лепш рабіць гэта да начыткі, пакідаючы спосаб расшыфроўкі за лінгвістам, а не за дыктарам);
2) адправіць атрыманы тэкст сэрвісу TranscriptionGenerator [20], выкарыстоўваючы яго праграмны інтэрфейс, і сфарміраваць на аснове яго адказу файл з лексіконам і транскрыпцыяй для слоў, якія сустракаюцца ў абзацы;
3) калі ўсе запісы будуць апрацаваны, сфармаваць агульны лексікон, аб'яднаўшы файлы для наяўных урыўкаў, адсартаваўшы іх і выдаліўшы радкі, якія паўтараюцца.

Атрыманая база мае структуру, паказаную на малюнку 4.1. Частка запісаў не апрацоўваецца, вынесена ў папку belorussian_test і можа выкарыстоўвацца пры тэставанні сістэмы – напрыклад, пры крос-валідацыі. Для пабудовы лінгвістычнай мадэлі, апроч здымкаў маўлення, патрабуецца іх тэкставая

транскрыпцыя, файл з выкарыставанымі фанемамі, файлы з фанемамі, якія пазначаюць цішыню і нераспазнаныя фанемы, файл з лексіконам, дзе на кожным радку размяшчаецца слова і яго фанетычная транскрыпцыя, а таксама файлы з адпаведнасцю запісаў дыктару, полам дыктараў і шляхамі да навучальных запісаў. Структура гэтых файлаў указана ў дадатку В.



Малюнак 4.1 – Структура акустычнай базы дадзеных

Атрыманая база змяшчае дзве тысячы чатырыста шаснаццаць запісаў пяцідзесяці васьмі дыктараў, сумарная працягласць якіх, палічаная з дапамогай праграмы SoXI, складае 11.8 гадзін. Пасля дадання начытаных аўтарам фрагментаў тэксту працягласцю чатыры хвіліны ў базе стала дзве тысячы чатырыста трыццаць пяць запісаў пяцідзесяці дзевяці дыктараў.

4.2. Стварэнне акустычных баз дадзеных для ангельскай мовы

Для стварэння акустычных баз дадзеных для ангельскай мовы было абрана два маўленчых корпуса: TIMIT – класічны корпус запісаў прамовы амерыканскіх дыктараў, прызначаны для ацэнкі работы сістэм распазнання прамовы, і адкрыты бясплатны корпус LibriSpeech, сабраны з запісаў чытання дыктарамі аўдыёкніг.

Корпус TIMIT змяшчае па дзесяць запісаў шасцісот трыццаці дыктараў; працягласць кожнага запісу складае каля двух секунд. Сумарная працягласць запісаў, палічыная з дапамогай SoXI, склала 4.7 гадзін (але на сайце TIMIT паказана 5.4 гадзіны).

Выбарка з корпуса LibriSpeech змяшчае пяць тысяч трыста дваццаць тры запісы васьмідзесяці дыктараў працягласцю каля трох секунд кожная. Сумарная працягласць запісаў, палічыная з дапамогай SoXI, склала 10.8 гадзін.

Структуру корпуса LibriSpeech давялося крыху змяніць, бо ў ёй у тэставай і навучальнай выбарках знаходзіліся запісы розных дыктараў. Гэта нармальна пры рашэнні задачы пераўтварэння маўлення ў тэкст, але для задачы ідэнтыфікацыі дыктара патрэбен аднолькавы набор дыктараў для навучання і распазнавання.

Таксама былі зменены файлы адпаведнасці спікераў запісам. У LibriSpeech запісы аднаго і таго ж дыктара ў розных аўдыторыях лічыліся запісамі розных дыктараў. Гэта было зроблена для павелічэння ступені нармалізацыі дыктараў у выпадку выкарыстання алгарытму лінейнага пераўтварэння прыкмет, які максімізуе сярэдняе праўдападабенства, пры фарміраванні лінгвістычнай мадэлі. Але для задачы ідэнтыфікацыі дыктара вынікі апынуліся лепш пры выкарыстоўванні сапраўдных суадносін.

4.3. Выбар інструментаў для распрацоўкі і разгортвання праграмы

Для распрацоўкі сэрвісаў, якія выконваюць мадэляванне і распазнаванне запісаў, была абрана мова праграмавання C++ у сілу яе кросплатформавасці, высокай хуткасці вылічэнняў, адносна лёгкай пераноснасці кода на C++ на мабільныя платформы і ўбудаваныя сістэмы і ў той жа час адноснай высокаўзроўневасці, а таксама ў сілу наяўнасці вялікай колькасці праверaных рэалізацый алгарытмаў апрацоўкі сігналаў і імавернаснага мадэлявання.

Пры выбары бібліятэк з адкрытым зыходным кодам, якія можна выкарыстоўваць для аналізу маўлення з мэтай выдзялення фанем, улічваліся вынікі, атрыманыя ў [27]. Сярод такіх кандыдатаў, як Hidden Markov Model Toolkit, HDecode і Julius, Pocketsphinx і Sphinx-4, Kaldi [28], апошняя з'яўляецца найбольш перадавым на дадзены момант інструментарыем працы з маўленнем, які паказаў найлепшыя вынікі пры вырашэнні задачы пераўтварэння вуснага маўлення ў тэкст. Для распрацаванай сістэмы ідэнтыфікацыі дыктара не трэба атрыманне выніковай тэкставай транскрыпцыі запісу, але трэба атрыманне разбіцця яе на фанемы. Таму было вырашана выкарыстоўваць Kaldi пры фарміраванні лінгвістычнай мадэлі.

Для напісання скрыптоў, якія ствараюць тэкставыя файлы з метаінфармацыяй для Kaldi і сэрвісу пабудовы мадэляў, выкарыстоўваліся скрыптовыя мовы Python і Perl; для напісання скрыптоў, якія запускалі праграмы Kaldi з патрэбнымі параметрамі, выкарыстоўваўся bash. У гэтым плане падтрымліваўся стыль працы з дадзенымі, прыняты ў Kaldi.

Для атрымання статыстычных, часавых, спектральных, танальных, рытмічных і іншых характарыстык сігналу была абрана кросплатформавая open-source бібліятэка Essentia. У параўнанні з аналагамі (Marsyas, OpenSmile) яна прапаноўвае найбольшую разнастайнасць даступных прыкмет маўлення, мае добрую дакументацыю і зручна спраектаваныя мадэлі вылічэння. Пры стварэнні мадэляў гаусавых сумесяў выкарыстоўвалася таксама кросплатформавая open-source бібліятэка лінейнай алгебры і матрычных вылічэнняў Armadillo.

Для чытання ўваходных дадзеных пры распазнаванні дыктара і пераўтварэнні іх да фармату PCM, акрамя стандартнай бібліятэкі Libsndfile, выкарыстана кросплатформавая бібліятэка Mpg123, бо Libsndfile не падтрымлівае фармат MPEG з-за патэнтавых абмежаванняў, якія існавалі на момант яе стварэння. Дзякуючы гэтаму падтрымліваецца мноства фарматаў ўваходных файлаў пры навучанні (wav, sphere, mp3, flac, speex і іншыя). Рэсэмпліраванне, мікшыраванне і выдаленне цішыні робіцца з дапамогай уціліты sox.

Для распрацоўкі вэб-сэрвісу, які прадастаўляе графічны інтэрфейс, абрана мова Java дзякуючы яе, зноў жа, кросплатформавасці і наяўнасці фрэймворкаў, якія робяць зручным стварэнне REST вэб-праграм (у прыватнасці, для распрацаванай праграмы выкарыстоўваўся Spring). Для стварэння вэб-старонак выкарыстоўваўся стэк HTML, CSS, JavaScript, Bootstrap, JQuery.

Разгортванне выконваецца з дапамогай платформы Docker і сістэм аўтаматычнай зборкі CMake (для C++ сэрвісаў) і Gradle (для вэб-сэрвісу). Кожны сэрвіс запускаецца ў асобным докер-кантэйнеры, абмен дадзеных паміж сэрвісамі ажыццяўляецца праз сокеты і сумесныя папкі. Канфігурацыя мапінга партоў HTTP, сокетаў і агульных папак апісваецца ў файле docker-compose, які дазваляе запускаць сістэму адной камандай. Вэб-сэрвіс запускаецца на ўбудаваным сэрвэры Apache Tomcat.

4.4. Рэалізацыя асноўных модуляў праграмы

Падсістэма здабывання прыкмет, выкарыставаная для вырашэння задачы 3.а, прадстаўлена дынамічнай бібліятэкай FeatureExtractor, якая ўключае класы SoundFile (счытванне файлаў і прывядзенне да адзінага фармату), FeatureExtractor (абстрактны клас здабывання прыкмет), MfccExtractor (вылічэнне MFCC), Preprocessor (папярэдняя апрацоўка сігналу), падпраграмы для разбіцця на вокны. Таксама падтрымліваецца магчымасць выкарыстоўваць пры навучанні мадэляў дыктара прыкметы, сфармаваныя на этапе пабудовы лінгвістычнай мадэлі, таму FeatureExtractor уключае падпраграмы для счытвання гэтых прыкмет і пераўтварэння з унутранага фармату Kaldi ў фармат, неабходны для далейшай пабудовы мадэляў дыктараў. Але трэба памятаць, што гэтыя прыкметы аптымізаваныя для вырашэння іншай задачы (разбіцця на фанемы), і

для дасягнення большай дакладнасці лепш здабываць прыкметы з дапамогай спецыяльна распрацаваных для гэтага падпраграм дадзенай бібліятэкі.

Для пабудовы лінгвістычнай мадэлі напісаны скрыпт train_ali.sh (гл. лістынг А.6 прыкладання А). Файлы, якія атрымліваюцца пры разбіцці на фанемы з дапамогай гэтай мадэлі, прыводзяцца да ўнутранага фармата з дапамогай perl-скрыптоў. Так, у лістынгу А.5 прыкладання А прыведзены скрыпт fotmat_ali_single.pl, які фармаціруе файлы разбіцця на фанемы запісаў новага дыктара.

Для выкліку і канфігурацыі неабходных скрыптоў Kaldi і скрыптоў фармаціравання пры разбіцці на фанемы запісаў новага дыктара напісаны скрыпт process.sh, прадстаўлены ў лістынгу А.9. Па ягоным выкананні ствараюцца файлы, дзе пазначаны межы фанем у запісах дыктара, а таксама дапаможны файл з ўнутранымі ідэнтыфікатарамі запісаў, якія выкарыстоўваюцца ў далейшым пры навучанні мадэляў дыктара.

Падсістэма пабудовы мадэляў дыктара прадстаўлена праграмай SpeakerModeler, у выніку выканання якой у названай папцы ствараюцца бінарныя файлы, якія захоўваюць мадэлі фанем кожнага дыктара, а таксама тэкставы файл model.txt, дзе пазначана колькасць дыктараў і адпаведнасць мадэляў фанем дыктарам. Прыклад запуску гэтай праграмы прыведзены ў скрыпце model.sh ў лістынгу А.7 прыкладання А.

Для распазнавання аўтараў запісаў патрабуецца толькі файл са шляхамі да гэтых запісаў. Падсістэмы аналізу распазнавання запісу і прыняцця рашэння рэалізаваны ў праграме SpeakerRecognizer, у выніку выканання якой фарміруецца тэкставы файл з указаннем ідэнтыфікатараў дыктараў для кожнага з названых запісаў. Прыклад запуску гэтай праграмы прыведзены ў скрыпце test.sh у лістынгу А.8 прыкладання А.

Для ацэнкі якасці распазнавання сістэмай дыктараў створана невялікая ўтыліта Test, якая параўноўвае адказы сістэмы з зыходнымі і падлічвае колькасць правільных адказаў.

Структура файлаў C++ сэрвісаў і ўтыліт прадстаўлена на малюнку 4.2.



Малюнак 4.2 – Структура файлаў C++ сэрвісаў

Вэб-інтэрфейс уяўляе сабой REST-сэрвіс. Запыты апрацоўваюцца ў кантролеры (клас HomeController), за перыядычную ачыстку файлаў, створаных пры апрацоўцы карыстацкі дадзеных, адказвае клас Cleanup, за загрузку даных з файлавай сістэмы – клас ResourceLoader. Клас SpringBootConfig адказвае за загрузку і канфігурацыю прыкладання, RecordPreprocessor – за папярэднюю апрацоўку карыстальнікіх запісаў, якая ўключае рэсэмпліраванне да 16 кГц, мікшыраванне ў адзін канал і выдаленне цішыні працягласцю больш за палову секунды.

У json файлах be.json і en.json захоўваюцца фрагменты тэкстаў, якія прапануецца прачытаць карыстальніку для дадання свайго голасу ў датасэт. Кожны прачытаны фрагмент правяраецца на адпаведнасць тэксту. Калі ён прачытаны правільна, для яго ствараецца файл з разбіццём на фанемы. Калі для ўсіх запісаў створана разбіццё на фанемы, карыстальнік можа адправіць іх на апрацоўку, пасля якой мадэлі яго фанем будуць улічвацца раўнапраўна з мадэлямі іншых дыктараў абранага датасэта.

Сайт аднастаронкавы, разметка знаходзіцца ў файле index.html, а логіка інтэрфейсу – у javascript-файлах папкі js. Структура файлаў праграмы прадстаўлена на малюнку 4.3.



Малюнак 4.3 – Структура файлаў вэб-сэрвісу

Для кожнага датасэта створана папка з запісамі дыктараў, лінгвістычнай мадэллю, інфармацыяй пра мову і дыктараў, дапаможнымі скрыптамі. Яе структура прадстаўлена на малюнку 4.4. Для кожнага карыстальніка ў папках data, exp, mfcc і exp/make_mfcc/data ствараюцца і перыядычна ачышчаюцца адпаведныя гэтаму карыстальніку папкі з яго дадзенымі.



Малюнак 4.4 – Структура файлаў датасэта

На малюнку 4.5 прадстаўлена структура файлаў Kaldi, якія выкарыстоўваюцца для фанемнага выраўноўвання на аснове загадзя загружаных на сервер лінгвістычных мадэляў.



Малюнак 4.5 – Структура файлаў Kaldi

На дадзены момант вэб-інтэрфейс змяшчае панэль выведу і панэль з наступнымі ўкладкамі:

- Example / Прыклад;
- Speakers / Дыктары;
- Record / Запісаць;

- Upload file / Загрузіць файл;
- Add yourself / Дабавіць сябе.

Падтрымліваецца інтэрфейс на англійскай і беларускай мовах з магчымасцю выбару мовы. Змест ўкладак прадстаўлены ў прыкладанні С.

4.5. Магчымасці паралелізацыі вылічэнняў

Па той прычыне, што навучанне лінгвістычнай мадэлі і мадэляў дыктараў патрабуе вялікіх часавых затрат, распрацаваная сістэма падтрымлівае шматпаточнасць. Самы працяглы працэс – фарміраванне лінгвістычнай мадэлі – можа выконвацца на некалькіх кластарах адначасова дзякуючы таму, што сістэма падтрымлівае працу з праграмным забеспячэннем для размеркаваных вылічэнняў, такім, як Sun Grid Engine і Slurm Workload Manager; падтрымліваецца і звычайнае шматпаточнае выкананне на адной машыне. Жаданая ступень і від паралелізацыі задаюцца ў адпаведных файлах канфігурацыі.

Праца кліенцкай часткі праграмы распаралельваецца з дапамогай пулаў патокаў, якія ствараюцца ў кожным сэрвісе.

5. Вынікі камп'ютэрных эксперыментаў

Якасць распазнавання дыктараў ацэньвалася з дапамогай крос-валідацыі, датасэты разбіваліся ў суадносінах 4:1.

Былі праведзены эксперыменты з рознай колькасцю гаусіан пры навучанні GMM фанем дыктара (гл. малюнак 5.1) і ўстаноўлена, што аптымальная колькасць гаусіан раўна тром. Меншай колькасці недастаткова для мадэлявання размеркавання верагоднасці фанемы, а пры большым многія фанемы прапускаюцца пры навучанні, бо маюць занадта малую працягласць. Для таго, каб для фанемы можна было пабудаваць GMM, трэба, каб колькасць участкаў сігналу, якімі гэта фанема прадстаўлена пры разбіцці яго на вокны, была не менш, чым колькасць гаусіан у мадэлі. Так, калі фанема доўжыцца 35 мс і запіс разбіваецца на вокны па 25 мс праз 10 мс, яна будзе прадстаўлена двума вектарамі і не будзе ўлічаная, калі колькасць гаусіан будзе больш за дзве.



Малюнак 5.1 – Залежнасць дакладнасці ідэнтыфікацыі ад памеру і кроку вокнаў і колькасці гаусіан (для ста дыктараў корпуса TIMIT)

Пры тэставанні распрацаванай сістэмы ідэнтыфікацыі дыктара на ста дыктарах корпуса TIMIT пры выкарыстанні толькі мел-частотных кепстральных каэфіцыентаў у якасці спектральных прыкмет была атрыманая дакладнасць 96%, а пры выкарыстанні дадатковых каэфіцыентаў IMFCC яна дасягала 98-100%. Эксперыменты паказалі, што для гэтага датасэта выкарыстанне IMFCC у дадатак да MFCC значна (да 20%) павялічвае дакладнасць ідэнтыфікацыі, асабліва пры павелічэнні колькасці дыктараў у датасэце (гл. малюнак 5.2). Разам з тым для датасета LibriSpeech даданне IMFCC прывяло да паляпшэння якасці распазнання ўсяго на 1%.



Малюнак 5.2 – Залежнасць дакладнасці ідэнтыфікацыі ад колькасці дыктараў пры выкарыстанні MFCC і IMFCC (корпус TIMIT)

Таксама былі даследаваны розныя памеры вокнаў і частата іх перакрыцця пры першапачатковым разбіцці запісаў. На малюнку 5.3 подпіс выгляду 20/7 азначае, што бралася акно памерам 20 мс праз кожныя 7 мс. Высветлілася, што важна, каб вокны перакрываліся больш, чым напалову, а аптымальныя памеры акна і інтэрвалу яго ўзяцця складаюць 25 і 10 мс адпаведна.

Малюнак 5.3 – Залежнасць дакладнасці ідэнтыфікацыі ад памеру і кроку акна (корпус LibriSpeech)

Акрамя гэтага, быў даследаваны ўплыў формы акна на дакладнасць распазнавання (гл. табліцу 5.1). Стандартам лічыцца акно Хэмінга, таму ў якасці аналагаў былі абраны таксама вокны высокага разрознення падобнага вонкавага выгляду. У прынцыпе, усе яны паказалі супастаўныя вынікі, а выкарыстанне акна Ланцоша нават трохі павялічыла дакладнасць. Але так як яго вылічэнне даўжэй, пры разбіцці запісаў было вырашана выкарыстоўваць акно Хэмінга.

Табліца 5.1 – Залежнасць колькасці правільна распазнаных запісаў корпуса LibriSpeech ад формы акна

Назва акна	**Выраз у дыскрэтным выглядзе:** **w(n), n=0…N-1**	**Колькасць правільна распазнаных запісаў**
Акно Хэмінга (Hamming window)	$\mathrm{w(n)} = 0.54 - 0.46\cos\left(\frac{2\pi n}{N-1}\right)$	152/160 (95%)
Акно Ханна (Hann window)	$\mathrm{w(n)} = 0.5 - 0.5\cos\left(\frac{2\pi n}{N-1}\right)$	151/160 (94%)
Акно Блэкмана (Blackman window)	$\mathrm{w(n)} = a_0 - a_1\cos\left(\frac{2\pi n}{N-1}\right) + a_2\cos\left(\frac{4\pi n}{N-1}\right)$ $a_0 = 0.42, \quad a_1 = 0.5, \quad a_2 = 0.08$	152/160 (95%)
Акно Ланцоша (Lanczos window), ці sinc – окно	$\mathrm{w(n)} = \mathrm{sinc}\left(\frac{2n}{N-1} - 1\right), \ sinc(x) = \frac{\sin(\pi x)}{\pi x}$	153/160 (96%)
Сінус-акно	$\mathrm{w(n)} = \sin\left(\frac{\pi n}{N-1}\right)$	151/160 (94%)

Таксама быў даследаваны ўплыў на дакладнасць ідэнтыфікацыі дыктара розных статыстычных ацэнак сігналу, апісаных у [28], у якасці дадатковых прыкмет (гл. табліцу 5.2). Першапачаткова ім былі нададзены невялікія вагі. Так як большасць з іх не прывялі да паляпшэння дакладнасці ідэнтыфікацыі, не даследавалася іх уплыў з вялікім вагай. Выкарыстанне цэнтроіда амплітуды сігналу трохі павялічыла дакладнасць, хоць не настолькі, каб апраўдаць трату рэсурсаў на яго вылічэнне.

Табліца 5.2 – Залежнасць колькасці правільна распазнаных запісаў корпуса LibriSpeech ад вылічэння дадатковых статыстычных характарыстык сігналу

Дадатковая прыкмета	**Колькасць правільна распазнаных запісаў**
Толькі MFCC і іх вытворныя	1030/1062 (97%)
RollOff (спад амплітудна-частотнай характарыстыкі)	1027/1062 (97%)

Працяг табліцы 5.2.

Дадатковая прыкмета	**Колькасць правільна распазнаных запісаў**
Zero Crossing Rate (частата перасячэння графіка амплітуды з нулём («частата пераходаў праз нуль» [17, с. 17]))	1028/1062 (97%)
Temporal Centroid (цэнтроід энергіі сігналу)	1031/1062 (97%)
Spectral Centroid (цэнтроід спектра сігналу)	1028/1062 (97%)
Root Mean Square (сярэднеквадратычнае значэнне спектру)	1028/1062 (97%)
Spectral Decrease (тэмп спаду спектральных значэнняў)	1027/1062 (97%)
Spectral Crest (стаўленне максімальнага значэння спектру да арыфметычнага сярэдняга)	1029/1062 (97%)
Spectral Flatness (стаўленне геаметрычнага сярэдняга да арыфметычнага)	1026/1062 (97%)

У адрозненне ад корпусаў англійскага маўлення, на корпусе беларускага маўлення даданне IMFCC прывяло да пагаршэння якасці распазнавання. Так, чыстыя MFCC далі дакладнасць 99%, а камбінацыя з IMFCC – толькі 95%. Для таго, каб праверыць, ці не залежаць вынікі дадання IMFCC ад аб'ёму дадзеных, даступных пры навучанні, былі праведзены эксперыменты са змяненнем гэтага аб'ёму на TIMIT (для ста дыктараў), вынікі якіх прадстаўлены на малюнку 5.4.



Малюнак 5.4 – Залежнасць дакладнасці ідэнтыфікацыі для розных камбінацый каэфіцыентаў ад колькасці дадзеных пры навучанні (корпус TIMIT)

Яны паказалі адсутнасць уплыву аб'ёму дадзеных, даступных пры навучанні, на перавагу адных каэфіцыентаў перад іншымі для абранага датасэта.



Малюнак 5.5 – Залежнасць дакладнасці ідэнтыфікацыі для розных камбінацый каэфіцыентаў ад колькасці дадзеных пры навучанні (корпус BelarusianSpeech)

Гэта было падцверджана і аналагічнымі эксперыментамі, якія былі праведзены з корпусам беларускага маўлення, як адлюстравана на малюнку 5.5.

Прычынай, па якой IMFCC могуць пагоршыць якасць распазнавання для распрацаванай мадэлі, можа быць іх карэляцыя з MFCC, а GMM мадэлі маюць на ўвазе некарэляванасць кампанентаў вектараў, на якіх яны будуюцца. У той жа час магчыма, што для корпуса TIMIT гэтая карэляцыя не такая моцная і дысперсія шуму ў цэлым менш. Таксама магчыма, што ў ангельскай мове больш, чым у беларускай, акцэнтаў, якія адрозніваюцца верхняй часткай спектру. Пацверджанне такой здагадкі апраўдала б выкарыстанне або невыкарыстанне IMFCC у залежнасці ад мовы датасета, але для гэтага патрабуюцца эксперыменты на вялікай колькасці датасэтаў розных моў.

6. Заключэнне

У ходзе праведзенай работы былі прааналізаваны існуючыя метады здабывання індывідуальных характарыстык чалавечага маўлення, спосабы пабудовы мадэляў дыктара і прыняцця рашэнняў для яго ідэнтыфікацыі. Была вывучана задача ідэнтыфікацыі дыктара, праблемы і абмежаванні, якія ўзнікаюць пры яе рашэнні, а таксама даследаваны сучасны сусветны рынак маўленчых тэхналогій і, у прыватнасці, існуючыя сістэмы ідэнтыфікацыі дыктараў, іх перавагі і недахопы, залежнасць ад мовы.

Таксама былі распрацаваны алгарытм тэкстанезалежнай ідэнтыфікацыі дыктара на аснове фанемнай сегментацыі і мадэляў гаусавых сумесяў і праграма, якая рэалізуе гэты алгарытм. Была створана акустычная база дадзеных для беларускай мовы, апрацаваны выбаркі запісаў мноства дыктараў з розных карпусоў маўлення і праведзены эксперыменты па ідэнтыфікацыі дыктараў пры розных параметрах сістэмы. Дакладнасць ідэнтыфікацыі склала 98% на ангельскім датасэце для ста дыктараў і 99% на беларускім датасэце для пяцідзесяці васьмі дыктараў пры найлепшых параметрах (акно Хэмінга або Ланцоша працягласцю 25 мс праз 10 мс, выкарыстанне цэнтроіда амплітуды сігналу, мадэляванне фанетычных GMM трыма гаусіанамі).

Перавагамі распрацаванай сістэмы з'яўляюцца:

- досыць высокая дакладнасць ідэнтыфікацыі дыктара;
- тэкстанезалежнасць;
- кросплатформеннасць сістэмы распазнавання дыктара;
- падтрымка мноства фарматаў гукавых файлаў;
- наяўнасць графічнага інтэрфейсу;
- лёгкасць дабаўлення ў сістэму новага дыктара.

Больш высокая якасць распазнавання ў параўнанні з традыцыйнымі тэкстанезалежнымі сістэмамі дасягаецца за кошт выкарыстання фанетычнай інфармацыі пры навучанні. Для існуючых сістэм, якія выкарыстоўваюць пабудову мадэляў гаусіан для фанем, пры ідэнтыфікацыі запіс таксама разбіваецца на фанемы, але гэта пагаршае якасць распазнавання ў выпадку, калі вымаўленага слова не было ў лексіконе, складзеным на аснове тэксту, вымаўленага дыктарамі пры навучанні. Разам з тым набор фанем, якія вымаўляюцца дыктарам, нашмат больш сталы, чым набор слоў. Працягласць нераспазнанай фанемы ў некалькі разоў менш, чым працягласць нераспазнанага слова, і адсутнасць яе ў слоўніку не так моцна адаб'ецца на якасці распазнання аўтара запісу, асабліва кароткай.

Устаноўлена, што ўплыў выкарыстання IMFCC ў якасці нізкаўзроўневых прыкмет на якасць распазнавання залежыць ад асаблівасцяў датасэта, у

прыватнасці, ад мовы, на якой гавораць дыктары. Таму пры распрацоўцы шматмоўных сістэм распазнання дыктараў пажадана ўлічваць асаблівасці мовы для павышэння якасці іх працы.

У будучыні плануецца працягнуць даследаванне ўплыву высокаўзроўневых характарыстык маўленчага сігналу на дакладнасць ідэнтыфікацыі, каб знайсці такія, якія дапамаглі б вылучыць аўтара запісу пры вялікай колькасці патэнцыйна магчымых дыктараў. У прыватнасці, плануецца даследаваць уключэнне фармантных частот у мадэлі фанем і магчымасць вылічэння частаты асноўнага тону дыктара на іх аснове, а таксама паэксперыментаваць з вылічэннем высокаўзроўневых характарыстык сігналу на прамежках канстантнай працягласці, якая перавышае памеры акна, але меншых, чым сярэдняя працягласць запісу. І, нарэшце, плануецца даследаваць эфектыўнасць ідэнтыфікацыі распрацаванай сістэмы на адкрытым мностве дыктараў і неабходнасць звязаных з гэтым мадыфікацый алгарытму прыняцця рашэнняў.

Спіс выкарыстаных крыніц

1. Сорокин В.Н., Вьюгин В.В., Тананыкин А.А. Распознавание личности по голосу. Аналитический обзор // Информационные процессы. – 2012. – Том 12, №1. – С. 1–30.
2. Рамишвили Г. С. Автоматическое опознавание говорящего по голосу. – М.: Радио и связь, 1981. – 224 с.
3. Лютова Д. А. Основные задачи и методы технологий распознавания говорящего по голосу // Вестник Московского государственного лингвистического университета: научно-технический журнал. - 2010. – Вып. 13. - С. 131–147.
4. Первушин Е.А. Обзор основных методов распознавания дикторов // Математические структуры и моделирование. – 2011. – Вып. 24. – С. 41–54.
5. Fusing High- and Low-Level Features for Speaker Recognition [Electronic resource]. – http://perso.telecom-paristech.fr/~chollet/Biblio/Cours/Biomet/Eurospeech03_SuperSIDFusionVfinal.pdf.
6. Швецов А.Г. Анатомия, физиология и патология органов слуха, зрения и речи: Учебное пособие. – Великий Новгород, 2006. – 68 с.
7. Signal Processing and Dynamic Time Warping. – http://www.ee.columbia.edu/~stanchen/fall12/e6870/slides/lecture2.pdf.
8. Christian Müller (Ed.). Speaker Classification I. – Springer-Verlag, Berlin Heidelberg, Germany, 2007. – P. 229–231.
9. S. Chakroborty and G. Saha. Improved Text-Independent Speaker Identification Using Fused MFCC and IMFCC feature Sets Based on Gaussian Filter // International Journal of Signal Processing. – 2009. – Vol. 5. No. 1. – P. 11–19.
10. Hynek Hermansky. Perceptual linear predictive (PLP) analysis of speech // J. Acoust. Soc. Am. –1990. – Vol. 87, No. 4. – P. 1738–1752.
11. Метод k-средних [Электрон. ресурс]. – https://ru.wikipedia.org/wiki/K-means.
12. EM-алгоритм [Электрон. ресурс]. – https://ru.wikipedia.org/wiki/EM-алгоритм.
13. Viterbi algorithm [Electronic resource]. – https://en.wikipedia.org/wiki/Viterbi_algorithm.
14. Comparative Study of Speaker Recognition Methods. DTW, GMM and SVM [Electronic resource]. – https://pdfs.semanticscholar.org/a143/9cc13f35aa5bf30b2a43071aedf84184aea9.pdf.
15. Gaussian Mixture Models and Introduction to HMM's [Electronic resource] – http://www.ee.columbia.edu/~stanchen/fall12/e6870/slides/lecture3.pdf.
16. Deep Neural Network Approaches to Speaker and Language Recognition [Electronic resource]. – https://groups.csail.mit.edu/sls/publications/2015/Dehak_IEEE-2015.pdf.

17. Voice Compare. Идентификация диктора по голосу [Электрон. ресурс]. – http://www.callcentre.by/index.php?area=1&p=static&page=voicecompare&print=1.
18. Corpus.by [Электрон. ресурс]. – http://corpus.by.
19. MLLR Transforms as Features in Speaker Recognition [Electronic resource]. – https://www.sri.com/sites/default/files/publications/mllr_transforms_as_features_in_speaker_recognition.pdf.
20. TranscriptionGenerator [Электрон. ресурс]. – https://ssrlab.grid.by/TranscriptionGenerator.
21. Combination of Features for Multilingual Speaker Identification with the Constraint of Limited Data [Electronic resource]. – https://pdfs.semanticscholar.org/c6d9/6088b98a41940b39285a143eb9d20d6b42ee.pdf.
22. Multilingual speaker recognition on Indian languages [Electronic resource]. – https://www.researchgate.net/publication/265314833_Multilingual_speaker_recognition_on_Indian_languages.
23. Text independent speaker identification in multilingual environments [Electronic resource]. – http://www.lrec-conf.org/proceedings/lrec2008/pdf/461_paper.pdf.
24. Speaker, accent, and language identification using multilingual phone strings [Electronic resource]. – https://www.ri.cmu.edu/pub_files/pub3/schultz_tanja_2002_1/schultz_tanja_2002_1.pdf.
25. Nautsch, A. Speaker verification using i-vectors: M.Sc. thesis / Hochschule Darmstadt, University of Applied Science, 2014. – 131p.
26. Dehak, N. [et al.] Front-End Factor Analysis for Speaker Verification // IEEE transactions on audio, speech, and language processing. – 2011. – Vol. 19. No. 4. – P. 788–797.
27. Comparing Open-Source Speech Recognition Toolkits [Electronic resource]. – http://suendermann.com/su/pdf/oasis2014.pdf.
28. Kaldi [Electronic resource]. – http://kaldi-asr.org.

ДАДАТАК А

ПРАГРАМНЫЯ ЛІСТЫНГІ

Лістынг А.1 – Ініцыялізацыя мадэляў дыктараў

```
void SpeakerModeler::BuildDictorModels(const map<int, map<int, vector<vector<double>>>>& features) const {
    map<int, map<int, gmm_diag>> models;
    for (auto& kv : features) {
        for (auto& fkv : kv.second) {
            if (fkv.second.size() >= gaussians) {
                gmm_diag model;
                mat F(fkv.second);
                if (model.learn(F, gaussians, maha_dist, random_subset, 10, 100, 1e-4, false)) {
                    models[kv.first][fkv.first] = model;
                }
            }
        }
    }
    WriteModel(modelFolder, modelPath, models);
}
```

Лістынг А.2 – Вылічэнне прыкмет запісу маўлення

```
void SpeakerModeler::ExtractBatchFeatures(const string& folder, const string& alignment_path,
    map<int, map<int, vector<vector<double>>>>& features, map<int, string>& files) {
    string line;
    int phoneme, record, dictor, prev_record = -1;
    int window_size_in_samples, hop_in_samples, sampling_rate, offset;
    const double window_offset = 0.25;
    double start, end;
    SoundFile sound;
    vector<double>& data = sound.getData();
    std::ifstream f(alignment_path);
    if (f.is_open()) {
        while (getline(f, line)) {
            SSCANF(&line[0], "%d %d %lf %lf %d", &dictor, &record, &start, &end, &phoneme);
            if (prev_record != record) {
                if (!sound.Initialize(folder + files[record])) {
                    fprintf(stderr, "Cannot parse file %s\n", (folder + files[record]).c_str());
                    return;
                }
                sampling_rate = sound.getSamplingRate();
                window_size_in_samples = windowSize * sampling_rate;
                offset = window_size_in_samples * window_offset;
                hop_in_samples = hop * sampling_rate;
                data = sound.getData();
                prev_record = record;
                printf("%d\n", record);
            }
            int start_in_samples = start * sampling_rate - offset;
            start_in_samples = std::max(start_in_samples, 0);
            int end_in_samples = end * sampling_rate + offset;
            end_in_samples = std::min(end_in_samples, static_cast<int>(data.size())) - window_size_in_samples;
            for (int i = start_in_samples; i < end_in_samples; i += hop_in_samples) {
                vector<double> input;
                input.reserve(window_size_in_samples);
```

```
                for (int j = 0; j < window_size_in_samples; ++j)
                {
                    input.push_back(data[i + j] * windowFunc(j, window_size_in_samples));
                }
                vector<double> segment_result;
                for (const auto &extractor : extractors)
                {
                    extractor->Extract(segment_result, input, sound);
                }
                features[dictor][phoneme].push_back(segment_result);
            }
        }
        f.close();
    }
    else {
        printf("Cannot open file %s\n", alignment_path.c_str());
    }
}
```

Лістынг А.3 – Вызначэнне дыктара па вылучаных прыкметах

```
void SpeakerRecognizer::ExtractFeatures(const string& path, vector<vector<double>>& tests) {
	SoundFile sound;
	if (!sound.Initialize(path)) {
		fprintf(stderr, "Cannot parse file %s\n", path.c_str());
		return;
	}
	int sampling_rate = sound.getSamplingRate();
	double window_size_in_samples = windowSize * sampling_rate;
	double hop_in_samples = hop * sampling_rate;
	const vector<double>& data = sound.getData();
	int end = data.size() - window_size_in_samples;

	for (int i = 0; i < end; i += hop_in_samples) {
		vector<double> input;
		for (int j = 0; j < window_size_in_samples; ++j) {
			input.push_back(data[i + j] * windowFunc(j, window_size_in_samples));
		}
		vector<double> segment_result;
		mfccExtractor.Extract(segment_result, input);
		tests.push_back(segment_result);
	}
}

int best_speaker(map<int, int>&result) {
	int max = 0;
	int best = 0;
	for (auto& kv : result) {
		if (kv.second > max) {
			max = kv.second;
			best = kv.first;
		}
	}
	return best;
}

int SpeakerRecognizer::TellSpeaker(const vector<vector<double>>& features) const {
	int best;
	map<int, int> result;
	for (auto& kv : dictors) {
		result[kv.first] = 0;
	}
	for (int i = 0; i < features.size(); i++) {
		double cur, max = -DBL_MAX;
		for (auto& kv : dictors) {
			for (auto& model : kv.second) {
				mat F(features[i]);
				cur = model.avg_log_p(F);
				if (cur > max) {
					max = cur;
					best = kv.first;
				}
			}
		}
		result[best]++;
	}
	return best_speaker(result);
}
```

Лістынг А.4 – Вылічэнне мел-частотных кепстральных каэфіцыентаў

```
void MfccExtractor::Extract(vector<double>& feature_vec, vector<double>& input) {
        int size = input.size();

        fftw_complex* in(static_cast<fftw_complex*>(fftw_malloc(sizeof(fftw_complex) * size)));
        fftw_complex* out(static_cast<fftw_complex*>(fftw_malloc(sizeof(fftw_complex) * size)));
        fftw_plan p(fftw_plan_dft_1d(input.size(), in, out, FFTW_FORWARD, FFTW_ESTIMATE));
        for (size_t j = 0; j < size; ++j) {
                in[j][0] = input[j];
                in[j][1] = 0;
        }
        fftw_execute(p);
        size /= 2;
        double* power_spectrum = new double[size];
        for (int i = 0; i < size; ++i) {
                power_spectrum[i] = sqrt(powf(out[i][0], 2) + powf(out[i][1], 2));
        }
        fftw_destroy_plan(p);
        fftw_free(in);
        fftw_free(out);

        for (int i = 0; i < mfccExtractors.size(); i++) {
                mfccExtractors[i]->GetLogCoefficents(power_spectrum, feature_vec);
        }
        delete[] power_spectrum;
}
```

Лістынг А.5 – Прывядзенне файлаў Калдзі да ўнутранага фармату сістэмы пры разбіцці на фанемы запісаў дыктара

```
#!/usr/bin/env perl

if (@ARGV != 3) {
  print STDERR "Usage: format_ali_single.pl <ctm-alignment-file> <record_number> <result-file>\n";
  print STDERR "Example: format_ali_single.pl exp/tri4a_ali/ali.1.ctm 1 result_ali.1.txt\n";
  exit(1);
}

$ctm_alignment = shift @ARGV;
$rec_number = shift @ARGV;
$result_alignment = shift @ARGV;

open $input, $ctm_alignment or die "Could not open $ctm_alignment: $!";
open $output, ">$result_alignment" or die "Could not open '$result_alignment' $!";
while($line = <$input>) {
  @words = split / /, $line;
  $end = @words[2] + @words[3];
  print $output "0 ".$rec_number." ".@words[2]." ".$end." ".@words[4];
}
close $input;
close $output;
```

Лістынг А.6 – Пабудова лінгвістычнай мадэлі і разбіццё на фанемы

```
#!/bin/bash
. ./cmd.sh

NJ=8

mfccdir=mfcc/train
x=data/train
./steps/make_mfcc.sh --cmd "$train_cmd" --nj $NJ $x exp/make_mfcc/$x $mfccdir
./steps/compute_cmvn_stats.sh $x exp/make_mfcc/$x $mfccdir

./steps/train_mono.sh --nj $NJ --cmd "$train_cmd" data/train data/lang exp/mono;
./steps/align_si.sh --nj $NJ --cmd "$train_cmd" data/train data/lang exp/mono
exp/mono_ali;

./steps/train_deltas.sh --cmd "$train_cmd" 2000 10000 data/train data/lang exp/mono_ali
exp/tri1;
./steps/align_si.sh --nj $NJ --cmd "$train_cmd" data/train data/lang exp/tri1
exp/tri1_ali;
./steps/train_deltas.sh --cmd "$train_cmd" 2500 15000 data/train data/lang exp/tri1_ali
exp/tri2a;
./steps/align_si.sh --nj $NJ --cmd "$train_cmd" --use-graphs true data/train data/lang
exp/tri2a exp/tri2a_ali;
./steps/train_lda_mllt.sh --cmd "$train_cmd" 3500 20000 data/train data/lang
exp/tri2a_ali exp/tri3a;
./steps/align_fmllr.sh --nj $NJ --cmd "$train_cmd" data/train data/lang exp/tri3a
exp/tri3a_ali;
./steps/train_sat.sh --cmd "$train_cmd" 4200 40000 data/train data/lang exp/tri3a_ali
exp/tri4a;
```

Лістынг А.7 – Пабудова мадэляў дыктараў

```
nj=8
cmd=utils/run.pl
program=./SpeakerModeler

. utils/parse_options.sh

if [ $# -lt 5 ] || [ $# -gt 6 ]; then
   echo "Usage: $0 <model-folder> <alignment-path> <record-folder> <record-location-file> [<log-dir>]";
   echo "Note: <log-dir> defaults to <model-folder>/log";
   echo "e.g.: $0 models data/train/result_ali data/LibriSpeech/dev-clean data/train/rec_map.txt";
   echo "Options: " ;
   echo "  --nj <nj>                                   # number of parallel jobs";
   echo "  --cmd (utils/run.pl|utils/queue.pl <queue opts>) # how to run jobs.";
   exit 1;
fi

if [ $# -ge 6 ]; then
  logdir=$5
else
  logdir=$model_folder/log
fi

model_folder=$1
ali_path=$2
record_folder=$3;
record_map=$4;

rm $logdir/*;
rm $model_folder/*;

$cmd JOB=1:$nj $logdir/speaker_modeler.JOB.log $program $model_folder/ model.JOB.txt ${ali_path}.JOB $record_folder/ $record_map;
echo "Dictor models have been successfully written to $model_folder.";
```

Лістынг А.8 – Распазнаванне дыктараў

```
program=./SpeakerRecognizer;

if [ $# -lt 5 ] || [ $# -gt 6 ]; then
   echo "Usage: $0 <model-folder> <record-folder> <test-file> <result-file> [<log-dir>]";
   echo "Note: <log-dir> defaults to <model-folder>/log";
   echo "e.g.: $0 models data/LibriSpeech/test-clean test_files.txt recognized.txt";
   exit 1;
fi
if [ $# -ge 6 ]; then
  logdir=$5
else
  logdir=$model_folder/log
fi
rm $logdir/*;

model_folder=$1
record_folder=$2;
test_files=$3;
result=$4;

tmpModelFile="$model_folder/tmp_model.txt";
modelFile="$model_folder/model.txt";

if [ -f $tmpModelFile ] ; then
    rm $tmpModelFile
fi
if [ -f $modelFile ] ; then
    rm $modelFile
fi

cat $model_folder/model.*.txt > $tmpModelFile;
./cat_models.pl $tmpModelFile $modelFile;

$program $result $model_folder model.txt $test_files $model_folder;
echo "Result has been successfully written to $result";
```

Лістынг А.9 – Разбіццё на фанемы запісаў новага дыктара на аснове існуючай лінгвістычнай мадэлі

```
#!/bin/bash

if [ $# -lt 4 ]; then
  echo "Usage: process.sh <kaldi-trunk> <source-folder> <user-id> <record-id>"
  exit 1
fi

kaldi=$1
source=$2
id=$3
rec_number=$4
steps=${kaldi}/egs/wsj/s5/steps
utils=${kaldi}/egs/wsj/s5/utils
src=${kaldi}/src

export train_cmd="run.pl --mem 2G"
export decode_cmd="run.pl --mem 4G"
export mkgraph_cmd="run.pl --mem 8G"

export KALDI_ROOT=${kaldi}
[ -f $KALDI_ROOT/tools/env.sh ] && . $KALDI_ROOT/tools/env.sh
export PATH=${utils}:$PATH
[ ! -f $KALDI_ROOT/tools/config/common_path.sh ] && echo >&2 "The standard file
$KALDI_ROOT/tools/config/common_path.sh is not present -> Exit!" && exit 1
. $KALDI_ROOT/tools/config/common_path.sh
export LC_ALL=C

pushd ${source}

ln -sf ${utils}/ .

if [[ ${source} == *en_Timit ]]; then
  base=${source/en_Timit/en_LibriSpeech}
  ln -sf ${base}/exp/tri4a exp/tri4a
  ln -sf ${base}/data/lang data/lang
fi

x=data/${id}
ali=exp/${id}

${steps}/make_mfcc.sh --cmd "$train_cmd" --nj 1 $x exp/make_mfcc/$x mfcc/${id} && \
${steps}/compute_cmvn_stats.sh $x exp/make_mfcc/$x mfcc/${id} && \
${steps}/align_fmllr.sh --nj 1 --cmd "$train_cmd" $x data/lang exp/tri4a ${ali} && \
${src}/bin/ali-to-phones --ctm-output exp/tri4a/final.mdl ark:"gunzip -c
${ali}/ali.1.gz|" -> ${ali}/ali.1.ctm && \
./format_ali_single.pl ${ali}/ali.1.ctm $x/ali.${rec_number} || { popd; exit 1; }

popd
exit 0;
```

ДАДАТАК В

СТРУКТУРА ФАЙЛАЎ ДЛЯ ПАБУДОВЫ ЛІНГВІСТЫЧНАЙ МАДЭЛІ

```
1089-134686-0000 HE HOPED THERE WOULD BE STEW FOR DINNER TURNIPS AND CARROTS AND BRUISED
1089-134686-0001 STUFF IT INTO YOU HIS BELLY COUNSELLED HIM
1089-134686-0002 AFTER EARLY NIGHTFALL THE YELLOW LAMPS WOULD LIGHT UP HERE AND THERE THE
1089-134686-0003 HELLO BERTIE ANY GOOD IN YOUR MIND
```

Малюнак В.1 – Файл text – тэкставая транскрыпця запісаў

```
1089-134686 m
1089-134691 m
1188-133604 m
121-121726 f
121-123852 f
121-123859 f
121-127105 f
```

Малюнак В.2 – Файл spk2gender з пазнакай пола дыктараў

```
1089-134686-0000 1089-134686
1089-134686-0001 1089-134686
1089-134686-0002 1089-134686
1089-134686-0003 1089-134686
1089-134686-0004 1089-134686
1089-134686-0005 1089-134686
1089-134686-0006 1089-134686
```

Малюнак В.3 – Файл utt2spk с пазнакай дыктара для кожнага запісу

```
134686-0000 flac -c -d -s /home/victoria/LibriSpeech/dev-clean/1089/134686/1089-134686-0000.flac |
134686-0001 flac -c -d -s /home/victoria/LibriSpeech/dev-clean/1089/134686/1089-134686-0001.flac |
134686-0002 flac -c -d -s /home/victoria/LibriSpeech/dev-clean/1089/134686/1089-134686-0002.flac |
134686-0003 flac -c -d -s /home/victoria/LibriSpeech/dev-clean/1089/134686/1089-134686-0003.flac |
134686-0004 flac -c -d -s /home/victoria/LibriSpeech/dev-clean/1089/134686/1089-134686-0004.flac |
134686-0005 flac -c -d -s /home/victoria/LibriSpeech/dev-clean/1089/134686/1089-134686-0005.flac |
```

Малюнак В.4 – Файл wav.scp з пазнакай шляхоў да запісаў з магчымасцю канвертавання "на ляту", выкарыстоўваючы камандныя канвееры

```
<oov>
AA0
AA1
AA2
AE0
AE1
AE2
```

Малюнак В.5 – Файл nonsilence_phones.txt з фанемамі, якія не пазначаюць цішыню

```
SIL
oov
```

Малюнак В.6 – Файл silence_phones.txt з фанемамі, якія пазначаюць цішыню

```
SIL
```

Малюнак В.7 – Файл optional_silence.txt

```
<oov> <oov>
DOG D AO1 G
DOING D UW1 IH0 NG
DOLL D AA1 L
```

Малюнак В.7 – Файл lexicon.txt з транскрыпцыяй слоў лексікону

ДАДАТАК С

СКРЫНШОТЫ ВЭБ-СЭРВІСУ

Малюнак С.1 – Укладка Example



Малюнак С.2 – Укладка Speakers



Малюнак С.2 – Укладка Record



Малюнак С.3 – Укладка Upload



Малюнак С.4 – Укладка Add yourself



Малюнак С.5 – Выбар датасэта